ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення
па адукацыі
Магілёўскага аблвыканкама
_________ А.Б.Заблоцкі
"18" кастрычніка 2023 г.

# ЗАДАННІ
## для правядзення рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА

Дата правядзення: 31 кастрычніка 2023 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 13.00.

**X клас**

| **Заданні** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1.** У беларускай мове для наймення кветак выкарыстоўваецца шэраг слоў, запазычаных з лацінскай мовы ці праз яе пасярэдніцтва. Запішыце назвы гэтых кветак па-беларуску.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| **Назвы кветак па-латыні** | **Пераклад на беларускую мову** |
|---|---|
| chrysanthemum | |
| cichorium | |
| gladiolus | |
| hyacinthus | |
| jasminus | |
| matthiola | |

**Заданне 2.** Унутраная форма слова – гэта прыкмета, якая ляжыць у аснове наймення. Напрыклад, унутранай формай назвы *падснежніка* з'яўляецца тое, што гэта кветка расце пад снегам.

Назавіце стравы і прадукты, якія маюць указаную ўнутраную форму.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| **Унутраная форма** | **Страва; прадукт** |
|---|---|
| з дабаўленнем крыві | |
| з прэснага цеста | |
| звараны з круп | |
| зробленая з вантробаў | |
| на мёдзе | |
| у яе мачаюць (макаюць) іншыя прадукты | |

**Заданне 3.** Варыянтамі слова называюць такія яго разнавіднасці, якія адрозніваюцца фанетычнымі, марфалагічнымі ці іншымі асаблівасцямі, аднак не маюць адрозненняў у лексічным значэнні і могуць свабодна ўзаемазамяняцца ў кантэксце.

Фанетычныя варыянты слова адрозніваюцца гукамі, акцэнтныя – месцам націску. Размяркуйце прапанаваныя пары слоў у табліцы:

*бу́йны – буйны́, веснавы́ – вясно́вы, гайса́ць – го́йсаць, дрэ́ўка – дрэ́ўца, кайда́ны – кайданы́, кмен – кмін, кры́лца – кры́льца, па́мятаць – памята́ць, пры́ме́та – прыкме́та, слата́ – сло́та, стральба́ – стрэ́льба, ця́жкі – цяжкі́.*

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| Варыянты слова | | | Не з’яўляюцца варыянтамі аднаго слова |
|---|---|---|---|
| фанетычныя | акцэнтныя | акцэнтна-фанетычныя | |
| | | | |

**Заданне 4.** Фіналь (канцавая частка слова) *-ха* ўласціва словам сучаснай беларускай мовы. Прывядзіце па адным прыкладзе слоў з гэтай фіналлю, якія адпавядаюць указанай у табліцы характарыстыцы.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| Характарыстыка слова | Слова з фіналлю *-ха* |
|---|---|
| невытворнае слова | |
| слова з нулявым суфіксам | |
| назоўнік з суфіксам *-х-* | |
| назоўнік з суфіксам *-ах-* | |
| назоўнік з суфіксам *-ух-* | |
| складанае слова | |

**Заданне 5.** Выпішыце са сказаў фразеалагізмы са структурай словазлучэння, вызначыце від падпарадкавальнай сувязі кампанентаў фразеалагізма і яго сінтаксічную ролю.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

1. Вучыцеся, дзеці! За прыгожыя вочы высокіх адзнак ніхто не ставіць.
2. Коні ў хляве былі слабыя, проста ад ветру валіліся.
3. Дырэктар запрасіў свавольніка вучня на два словы.
4. А яна – такой бяды! – адразу выйшла замуж.
5. Ніяк не вазьму ўцям, чаму ты не хочаш паступаць ва ўніверсітэт.
6. У горадзе Янка сустрэў шмат аматараў пагрэць рукі.

| № | Фразеалагізм | Від падпарадкавальнай сувязі | Роля ў сказе |
|---|---|---|---|
| 1 | | | |
| 2 | | | |
| 3 | | | |
| 4 | | | |
| 5 | | | |
| 6 | | | |

**Заданне 6.** Выберыце ў кожным сказе правільную словаформу і запішыце яе ў калонцы справа.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| № | Сказ | Правільная словаформа |
|---|---|---|
| 1 | – Сёння на ўроку мы *(рашым, рошым, рэшым)* некалькі складаных задач, – паведаміла настаўніца матэматыкі. | |
| 2 | За гераічны ўчынак хлопец быў узнагароджаны *(медалем, медалём, медаллю)*. | |
| 3 | За *(паўтара, паўтары, паўтарыма)* тыднямі адпачынку пачаліся працоўныя будні. | |
| 4 | Яны хацелі набыць сабе кватэру, але не хапіла *(грашэй, грошай, грошаў)*. | |
| 5 | (*Урадлівейшыя, найўрадлівейшыя, найбольш ўрадлівыя*) глебы ў Беларусі знаходзяцца ў Нясвіжскім раёне. | |
| 6 | Бацькі любілі расказваць сваякам аб (*дачцэ, дочкі, дочцы*). | |

**Заданне 7.** У Рэспубліцы Беларусь прынята прысвячаць кожны новы каляндарны год якой-небудзь важнай грамадскай ідэі. Перакладзіце на беларускую мову інфармацыю пра 2021 год, ужываючы, дзе трэба, вялікую літару.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Президент беларуси подписал указ № 1 «об объявлении 2021 года годом народного единства». Решение принято в целях консолидации общества, сплочения белорусского народа на основе идей суверенитета и независимости страны.

Согласно указу совет министров совместно с облисполкомами и минским горисполкомом должен разработать и утвердить республиканский план мероприятий по проведению года народного единства, а также обеспечить координацию деятельности государственных органов, других организаций по выполнению этого плана.

**Заданне 8.** Сярод фактаў, звязаных з характарыстыкай цвёрдых форм верша, знайдзіце памылковыя і адзначце іх кружочкам.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| Цвёрдыя формы верша | Факты |
|---|---|
| Санет | 1. Складаецца з 14 радкоў.<br>2. Часцей за ўсё пішацца анапестам.<br>3. Нярэдка выкарыстоўваў у сваёй творчасці Максім Багдановіч.<br>4. Ключ санета – апошнія два радкі верша. |
| Трыялет | 1. Паўтараюцца першы і апошні радкі, а таксама трэці і сёмы.<br>2. Складаецца з васьмі радкоў.<br>3. Адносіцца да ліра-эпасу.<br>4. Назва паходзіць ад таго, што адзін радок паўтараецца тройчы. |
| Актава | 1. Рыфмаграма актавы: *абабабвв*.<br>2. У двух апошніх радках акцэнтуецца ўвага на ідэі твора.<br>3. Адносіцца да лірыкі.<br>4. Гэта адна з любімых форм Якуба Коласа, таму ён часта выкарыстоўваў яе ў сваёй творчасці. |

**Заданне 9.** Па ўрыўку пазнайце твор і назавіце яго аўтара.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| | |
|---|---|
| А | Пячнік нічога не зразумеў. Ды, відаць, і не чуў. Бледны, без шапкі на лысіне, аброслы сівеючай шчэццю, ён упёрся ў немца скамянелымі вачыма і маўчаў. Толькі бяскроўныя губы перасмыкаліся, як ад нязбытнага жадання гаварыць.<br>Улетку ён рабіў зондэрфюрэру печы. Знайшлі яго і прывялі, вядомага на ўсю ваколіцу. Пяць раніц дзяжурны жандар абшукваў яго і кожны раз аднолькава весела знаходзіў у кішэнях майстра тое самае крэсіва, самасад і кавалак чорнага хлеба. А печы атрымаліся выдатныя. Кухар хваліць пліту, а сам зондэрфюрэр – грубку з белай кафлі. Вось і цяпер ён ледзь не заахкаў на ўспамін аб яе гладкай цеплыні. |
| Б | Доўгі дзень прайшоў – і не ўгледзіць калі. Схадзіў Архіп у поле, пабыў у лесе, даведаўся дзе-каго з бліжэйшай радні, абгледзеў сад.<br>Увечары ён захацеў беспрыменна ісці начаваць у новую хату. Узяў кажух, табаку, падушку. Бацьку таксама пажадалася пайсці з сынам: пайшоў і ён.<br>Новая хата была ў канцы саду, недалёчка ад шляху і блізка к рэчцы. Пабудавана была добра; Архіп ладна зарабляў леташні год урокамі, у сябе грошы меў і яшчэ сабраў бацькам на хату.<br>Пайшлі, агледзеліся. Бацька паклаўся на халодненькай грубцы, а студэнт лёг на лаўцы каля акна. Дзверы ён запёр, а акно, дзе ляжаў, адчыніў для свежага паветра.<br>Пад акном шамацела лісце на яблыньках і дулях. На небе збіраліся хмары, недзе далёка-далёка бліскала маланнне. |
| В | "Бывай, Сашок, бывай! Не плач. Я ніколі не забуду цябе – ты дала мне столькі шчасця! Я на крылах прылячу да цябе. Праз год. Гэта хутка, вельмі хутка..." Постаць Сашы знікла. Больш Пятро не мог убачыць яе. Ён уздыхнуў і падняў з зямлі свой партфель... |
| Г | На пяцьдзясят вёрст выгінастага рэчышча быў толькі адзін паром, на вярсту вышэй ад горада. Яго нельга было аддаць у рукі паўстанцам, якія маглі б такім чынам парушыць сувязь паміж часцямі карных войск і біць іх паасобку. Дзеля гэтага на левы, процілеглы гораду бераг Дняпра генерал Фікельмонт выслаў роту выпрабаваных у баях салдат пад камандай капітана <…>. |

| Урывак | Назва твора | Аўтар |
|---|---|---|
| *А* | | |
| *Б* | | |
| *В* | | |
| *Г* | | |

**Заданне 10**. Запішыце тры апавяданні пра дзяцей, якія вы вывучалі на ўроках беларускай літаратуры, а таксама аўтараў гэтых твораў.

Назавіце шэсць агульных рыс гэтых твораў, акрамя ўжо названых.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| № | Назва твора | Аўтар |
|---|---|---|
| *1* | | |
| *2* | | |
| *3* | | |

*Агульныя рысы:*

1. *Героямі з'яўляюцца дзеці.*
2. *Жанр – апавяданне.*
3. ______
4. ______
5. ______
6. ______
7. ______
8. ______

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага
ўпраўлення
па адукацыі
Магілёўскага аблвыканкама
________
А.Б.Заблоцкі
“18” кастрычніка 2023 г.

**ЗАДАННІ**
**для правядзення рэспубліканскай алімпіяды**
**па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”**

**ВОДГУК**

Дата правядзення: 30 кастрычніка 2023 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 14.00.

**X клас**

* * *

Будзе слоту абвяшчаць прагноз,
Лістабой учыніць ператруску.
Песняй, што расчуліла да слёз,
Я прыму цябе па-беларуску.

Краю блаславёнага дачка,
Дзякуй лёсу,
маю не ў нагрузку –
Зорны крыж Мацея Бурачка...
Ты ўва мне прызнаеш беларуску?

Сто разоў шукай другой красы,
А тым больш што свет даўно не вузкі!
...Ды калі ты не бязродны сын –
Гавары са мной па-беларуску.

Час – вар’ят, шалёнае таксі.
Толькі ўсё ж не мыслю я аб спуску.
Кажаш, што магілы зараслі?
Памаўчы са мной па-беларуску.

*Яўгенія Янішчыц*
*1984*